# МОВАЗНАЎСТВА

УДК 483(07)

*В. І. Свірыдзенка*

## РАЗВІЦЦЁ МАЎЛЕННЯ ВУЧНЯЎ ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАЎ У ПРАЦЭСЕ ЗАСВАЕННЯ СПАЛУЧАЛЬНАСЦІ АБСТРАКТНЫХ НАЗОЎНІКАЎ

Каб мова дапамагала грамадству адлюстроўваць, пазнаваць, аб'ектыўна асэнсоўваць існуючы свет, неабходна выкарыстоўваць усе яе моўныя формы і адзінкі ўсіх узроўняў. Пры гэтым поўнае функцыянаванне кожны моўны сродак атрымлівае толькі на сінтаксічным узроўні. У гэтай сувязі вывучэнне сінтаксічнага матэрыялу займае значнае месца на ўроках беларускай мовы ўжо ў пачатковых класах. Увага дзяцей звяртаецца на адносіны, што ўзнікаюць паміж кампанентамі сінтаксічных канструкцый. Праграма прадугледжвае засваенне малодшымі школьнікамі словазлучэння і сказа. Па аб'ёме моўнага матэрыялу цэнтральнае месца займае сказ. Дзякуючы сказу мова выконвае камунікатыўную функцыю і становіцца магчымай пабудова выказванняў больш высокага ўзроўню. Але гэта не змяншае ролі слова і словазлучэння, паколькі без іх не існаваў бы сказ.

Даследчыкі Г. А. Валошанка, Л. П. Падгайскі, В. У. Протчанка, Г. А. Фамічова падкрэсліваюць, што авалоданне мадэлямі найбольш ужывальных словазлучэнняў, іх аналіз і сінтэз з'яўляюцца неабходнай умовай, пры якой школьнікі набываюць моўныя навыкі. Засваеннем правілаў спалучальнасці слоў, на думку вучоных, неабходна займацца на кожным уроку, асабліва пры вывучэнні лексікі, марфалогіі, словаўтварэння.

Разгледзім, якія магчымасці для развіцця мовы вучняў пачатковых класаў дае праца са словазлучэннем. Зробім гэта на прыкладзе вывучэння школьнікамі спалучальнасці адной лексіка-семантычнай групы абстрактных назоўнікаў. Пры гэтым будзем карыстацца пастулатам В. У. Вінаградава, што «аддзел сінтаксісу, прысвечаны вучэнню пра формы і законы спалучальнасці слоў, пра спосабы ўтварэння словазлучэнняў, пра тыпы словазлучэнняў і спосабы распаўсюджвання словазлучэнняў, іх сувязі адно з адным, хоць і мяжуе з вучэннем пра сказ, блізка падыходзіць і падводзіць да яго, але ад яго не залежыць» [1]. У вышэй

вызначаным раздзеле разглядаюцца (у межах пачатковых класаў):

1) спосабы распаўсюджвання розных часцін мовы;

2) спосабы распаўсюджвання словазлучэнняў, іх сувязі;

3) тыповыя ўласцівасці спалучэння слоў у структуры сказа.

В. Р. Кастамараў падкрэслівае, што «для глыбокага валодання мовай вучням неабходна засвоіць правілы ўжывання слова, его спалучальнасці з іншымі словамі. Гэтыя правілы, што грунтуюцца на граматычных нормах, залежаць таксама ад лексічнага значэння слоў, якое абумоўлівае здольнасць дадзенага слова спалучацца з іншымі, а часткова і формы гэтых спалучэнняў» [2, с. 39]. Такую працу трэба пачынаць у пачатковых класах. Неабходна звярнуць увагу дзяцей на лексічную і граматычную спалучальнасць абстрактных назоўнікаў, якія абазначаюць пачуцці чалавека ў адносінах да асобы, што паспрыяе вырашэнню шэрага выхаваўчых задач. Да таго ж гэтымі словамі малодшыя школьнікі карыстаюцца на працягу чатырох гадоў навучання не толькі на ўроках беларускай мовы і чытання, але і пры вывучэнні курса «Чалавек і свет». Пры ўжыванні абстрактных назоўнікаў вучні часта парушаюць лексічныя, граматычныя і акцэнталагічныя нормы. Гэта абумоўлена:

1) адсутнасцю працы з лексічнай і граматычнай спалучальнасцю слоў увогуле і абстрактных назоўнікаў, якія абазначаюць пачуцці чалавека ў адносінах да асобы, у прыватнасці;

2) няведаннем лексічнага значэння абстрактных назоўнікаў, якія абазначаюць пачуцці чалавека ў адносінах да асобы;

3) няўменнем утварыць граматычную форму роду, ліку, склону залежнага кампанента ў словазлучэнні, у якім галоўным словам з'яўляецца абстрактны назоўнік.

Сярод абстрактных назоўнікаў указанай групы варта выдзеліць словы, што абазначаюць:

1) станоўчыя пачуцці ў адносінах да асобы (міласэрнасць, любоў);

2) адмоўныя пачуцці (гнеў, помслівасць);

3) пачуцці чыста ўнутранага характару (рашучасць, сарамлівасць).

Для засваення малодшымі школьнікамі семантыкі гэтых слоў можна прапанаваць такія практыкаванні:

• Падкрэсліць у тэксце назоўнікі, якія абазначаюць пачуцці чалавека, растлумачыць іх сэнс.

Што значыць добры чалавек? Ён адносіцца да людзей з душэўнасцю, чуласцю, уважлівасцю, шчырасцю, сардэчнасцю, спагадлівасцю, справядлівасцю, праўдзівасцю, цікавасцю. Дабрата неабходна ўсім, з кім жывеш, сябруеш, працуеш, вучышся. Такія людзі карыстаюцца любоўю, павагай (А. Вольскі). (III клас)

• Падкрэсліць назоўнікі, якія абазначаюць станоўчыя пачуцці чалавека.

Павага, гнеў, абурэнне, літасць, смеласць, абыякавасць, бесчалавечнасць, спагадлівасць, лютасць, удзячнасць, спачуванне, шчырасць. (III клас)

Вывучэнне спалучальнасці слоў выступае важным аспектам у тэарэтычных і практычных даследаваннях: у выяўленні суадносін элементаў зместу і спосабаў яго выражэння, у перакладах з адной мовы на другую, у развіцці культуры маўлення.

Лексічная спалучальнасць — сукупнасць лексічных валентнасцяў слова. Выяўленне яе прадугледжвае вызначэнне кола слоў, з якімі гэта слова можа існаваць у звязнай мове, і ўмоў рэалізацыі спалучэнняў.

Абстрактныя назоўнікі, якія абазначаюць пачуцці чалавека ў адносінах да асобы, спалучаюцца з дзеясловамі наступных лексіка-семантычных груп:

1) працяглага ўздзеяння (песціла з любоўю);
2) перамяшчэння (набліжаўся з рашучасцю);
3) пераўтваральнага ўздзеяння (поўніўся гонарам);
4) адносін (паважаць за смеласць);
5) дзейнасці (усміхнуўся з удзячнасцю);
6) працяглага (нязменнага) стану (жыць з трывогай);
7) руху (пайшоў на самаахвяраванне);
8) зменнага стану (знікла незадавальненне).

Для засваення школьнікамі лексічнай спалучальнасці абстрактных назоўнікаў з дзеясловамі можна прапанаваць наступнае практыкаванне:

• Падабраць да назоўнікаў дзеясловы, вызначыць склон назоўнікаў.

... з гонарам, ... з ліслівасцю, ... з цікавасцю, ... з павагай, ... з рашучасцю.

Растлумачыць сэнс назоўнікаў. З адным словазлучэннем скласці сказ. (III клас)

Абстрактныя назоўнікі, якія абазначаюць пачуцці чалавека ў адносінах да асобы, спалучаюцца з назоўнікамі, што называюць:

1) асоб (павага да маці);
2) расліны (замілаванне да лілей);
3) з'явы грамадскага жыцця (незадаволенасць дэманстрацыяй);
4) апрадмечаныя прыкметы (удзячнасць за стараннасць);
5) апрадмечаныя дзеянні (расчараванне ў выбары);
6) сукупнасць асоб (а не прадметаў) як непадзельнае цэлае (шчырасць моладзі).

Для асэнсавання лексічнай спалучальнасці назоўнікаў малодшым школьнікам можна прапанаваць наступныя практыкаванні:

• У словазлучэннях замяніць галоўныя словы словамі, што ў дужках. У атрыманых словазлучэннях падкрэсліць прыназоўнікі.

Любіць прыроду (любоў), ненавідзець ворага (нянавісць), цікавіцца чалавекам (цікавасць), спачуваць хворым (спачуванне), пагарджаць паходжаннем (пагарда). (III клас)

• Запісаць словазлучэнні, замяніць у іх дзеясловы аднакарэннымі назоўнікамі. Падкрэсліць прыназоўнікі і вызначыць склон назоўнікаў.

Любавацца прыродай, паважаць бацькоў, цікавіцца мастацтвам, любіць родных, спачуваць інвалідам. (IV клас)

Абстрактныя назоўнікі даследаванай групы спалучаюцца з прыметнікамі:

1) якаснымі, якія:

— абазначаюць якасці і ўласцівасці, што ўспрымаюцца непасрэдна органамі пачуццяў (горкае расчараванне, цёплая ветлівасць);

— называюць прасторавыя і часавыя прыкметы (вялікая зацікаўленасць, доўгае абурэнне);

— выражаюць прыватную і агульную ацэнку (хваравітая насцярожанасць, цудоўная пранікнёнасць);

2) адноснымі, якія абазначаюць прыкмету праз адносіны:

— да месца знаходжання і часу існавання (вясковая сціпласць, учарашняе хваляванне);

— прыналежнасці (настаўніцкая патрабавальнасць);

3) прыналежнымі, якія абазначаюць:

— індывідуальную прыналежнасць (бабуліна сардэчнасць);

— прыналежнасць цэламу класу асоб (дзявочая сарамлівасць, юнацкая парывістасць).

Для засваення лексічнай спалучальнасці абстрактных назоўнікаў з прыметнікамі рэкамендуецца выкарыстаць практыкаванні:

• Падабраць да назоўнікаў прыметнікі, словазлучэнні запісаць.

Нянавісць, ветлівасць, трывога, пагарда, спачуванне, любоў. (III клас)

• Падабраць прыметнікі, блізкія па значэнні.

Страшная (лютая, смяротная, жудасная) нянавісць; вялікая (глыбокая, шчырая, сардэчная) удзячнасць. (IV клас)

• Уставіць прапушчаныя назоўнікі разам з прыметнікамі.

1) У сэрцах беларускіх партызан была ... ... да фашыстаў. 2) ... ... да незнаёмага чалавека ўвесь час павялічвалася. 3) У голасе чалавека, які выступаў, чулася ... ... да ветэранаў вайны. 4) Кожная маці глядзіць на сваё дзіця з ... ... .

Словазлучэнні для даведак: вялікая любоў, лютая нянавісць, глыбокая павага, шчырая зычлівасць. (IV клас)

Абстрактныя назоўнікі, якія абазначаюць пачуцці чалавека ў адносінах да асобы, спалучаюцца з займеннікамі ўсіх разрадаў:

1) асабовымі (вернасць мне);

2) зваротным (спачуванне да сябе);

3) прыналежнымі (мая адкрытасць);

4) азначальнымі (увесь гнеў);

5) пытальна-адноснымі (нянавісць каго);

6) адмоўнымі (ніякай жаласці);

7) няпэўнымі (нейкая трывога).

Пры вывучэнні тэмы «Займеннік» у IV класе вучням можна прапанаваць наступнае практыкаванне:

• Да назоўнікаў, што ў левым слупку, падабраць займеннікі з правага слупка. Словазлучэнні запісаць. З адным словазлучэннем скласці сказ.

| | |
|---|---|
| Вернасць | мне |
| Нянавісць (да) | цябе |
| Хваляванне (за) | яе |
| Спачуванне (да) | яму |
| Жаласць (да) | табе |
| Суровасць (да) | яго |

Абстрактныя назоўнікі, якія абазначаюць пачуцці чалавека ў адносінах да асобы, спалучаюцца са словамі з няпэўна-колькасным значэннем (столькі добразычлівасці, колькі варожасці).

Заканамернасці ўтварэння розных тыпаў словазлучэнняў пры пабудове сказаў усведамляюцца ў выніку засваення правілаў спалучальнасці слоў. На парадыгме граматычных форм слова заснавана яго граматычная спалучальнасць з іншымі словамі, якая можа быць матывавана лексічным значэннем слова, абумоўлена яго лексіка-граматычнымі асаблівасцямі, можа выклікацца толькі граматычнымі фактарамі, пэўнай граматычнай катэгорыяй без уплыву канкрэтнага лексічнага значэння (незалежнасць ад канкрэтнага лексічнага значэння сведчыць пра чыста граматычную прычыну спалучальнасці, пра тое, што граматычная катэгорыя галоўнага слова мае патрэбу ў пэўнай форме залежнага).

Абстрактныя назоўнікі, якія абазначаюць пачуцці чалавека ў адносінах да асобы, уступаюць у спалучэнне з дзеясловамі прошлага, цяперашняга, будучага часу і ўжываюцца ў форме:

1) назоўнага склону (мільганула думка);

2) роднага склону з прыназоўнікамі **ад, з-за, без** (задыхалася ад прагнасці) і без прыназоўніка (хапала супярэчлівасці);

3) давальнага склону без прыназоўніка (радавацца шчырасці);

4) вінавальнага склону з прыназоўнікамі **за, пра, на** (паважаць за сумленнасць) і без прыназоўніка (адчуваць нянавісць);

5) творнага склону з прыназоўнікам **з (са)** (назіраў з трывогай) і без прыназоўніка (славіцца сардэчнасцю);

6) меснага склону з прыназоўнікам **аб** (гаварылі аб міласэрнасці).

Вучыцца спалучаць абстрактныя назоўнікі з дзеясловамі дзеці змогуць, выконваючы наступныя практыкаванні:

• Паставіць пытанне ад галоўнага слова да залежнага, вызначыць склон назоўнікаў.

Смяяцца ад шчасця, глядзець з замілаваннем, паважаць дарослых, чакаць з хваляваннем, прапанаваць з ветлівасцю, прамовіць з павагай. (III клас)

• Далучыць да дзеясловаў назоўнікі, якія абазначаюць пачуцці, скласці з атрыманымі словазлучэннямі сказы.

Глядзець з ... , гаварыць з ... , крычаць ад ... , радавацца ... . (IV клас)

Абстрактныя назоўнікі, якія абазначаюць пачуцці чалавека ў адносінах да асобы, уступаюць у спалучэнне з назоўнікамі:

1) адзіночнага і множнага ліку ў родным склоне без прыназоўніка (добразычлівасць гаспадара) і з прыназоўнікам **да** (павага да настаўніка);

2) якія абазначаюць апрадмечаныя дзеянні; абстрактны назоўнік стаіць у форме вінавальнага склону з прыназоўнікам за (падзяка за шчодрасць) або ў форме творнага склону з прыназоўнікам з **(са)** (сутыкненне з варожасцю);

3) такімі, як **пачуццё, сіла, праяўленне,** тады абстрактны назоўнік стаіць у форме роднага склону без прыназоўніка (пачуццё незадавальнення);

4) адзіночнага і множнага ліку ў давальным склоне без прыназоўніка (вернасць сябру);

5) адзіночнага і множнага ліку ў месным склоне з прыназоўнікам у (расчараванне ў чалавеку).

Засваенне малодшымі школьнікамі граматычнай спалучальнасці абстрактных назоўнікаў, якія абазначаюць пачуцці чалавека ў адносінах да асобы, з іншымі назоўнікамі адбываецца пры выкананні, напрыклад, такіх практыкаванняў:

• Замест пытанняў паставіць назоўнікі ў патрэбных склонах.

Павага да каго?, любоў да чаго?, цікавасць да каго?, лютасць да каго?, літасць да каго? (III клас)

• Назоўнікі, што ў дужках, паставіць у родным склоне з патрэбнымі прыназоўнікамі.

Лютасць (вораг), цікавасць (чалавек), строгасць (вучань), павага (бацька). (IV клас)

• Нераклaсці сказы на беларускую мову.

1) На родину он приезжал с чувством волнения. 2) В голосе ученицы слышалось уважение к учителям. 3) Произведения Якуба Коласа наполнены любовью к своей родине. (IV клас)

Наступныя практыкаванні дапамогуць вучням асэнсаваць, што род, лік і склон прыметніка паказваюць на сувязь яго з адпаведным назоўнікам.

• Прыметнікі, што ў дужках, пастаўце у патрэбнай форме, каб атрымаліся словазлучэнні. Вызначыць род, лік, склон прыметнікаў. З адным словазлучэннем скласці сказ.

(Моцны) хваляванне, (шчыры) павага, (страшэнны) няўдзячнасць, (люты) нянавісць, (поўны) задаволенасць. (ІІІ клас)

• З прапанаваных слоў скласці сказы. Вызначыць род, лік і склон прыметнікаў.

1. У, нараджацца, маё, сэрца, страшны, нянавісць, да, фашысты.

2. Я, глядзець, людзі, на, хворыя, са, спачуванне, шчыры. (IV клас)

Абстрактныя назоўнікі, якія абазначаюць пачуцці чалавека ў адносінах да асобы, спалучаюцца з асабовымі займеннікамі ў форме:

1) адзіночнага і множнага ліку ў родным склоне з прыназоўнікам **да** (нянавісць да яго);

2) адзіночнага і множнага ліку ў давальным склоне без прыназоўніка (вернасць нам);

3) адзіночнага і множнага ліку ў вінавальным склоне з прыназоўнікам **за** (трывога за цябе);

4) адзіночнага і множнага ліку ў творным склоне без прыназоўніка (незадаволенасць імі) і з прыназоўнікамі **перад, з** (слабасць перад імі);

5) адзіночнага і множнага ліку ў месным склоне з прыназоўнікам **у** (расчараванне ў ёй).

Уменне ўжываць асабовыя займеннікі ў сказе ў патрэбнай форме можна выпрацаваць у дзяцей пры выкананні наступнага практыкавання:

• З прапанаваных слоў скласці сказы.

1. Я, адносіцца, да, бацькі, з, любоў. Жыць, у, сэрца, павага, да, яны.

2. Я, ганарыцца, свая, Радзіма. Любоў, да, яна, жыць, у, мая, душа.

3. Маці, заўсёды, пра, свае, дзеці, клапаціцца. Хваляванне, за, яны, не, пакідаць, яна, ніколі.

Абстрактныя назоўнікі, якія абазначаюць пачуцці чалавека ў адносінах да асобы, у спалучэнні са словамі з няпэўна-колькасным значэннем маюць форму роднага склону без прыназоўніка (столькі гордасці).

Такім чынам, практыкаванні, якія прапануюцца ў артыкуле, мэтазгодна выкарыстаць у ІІІ і IV класах пры вывучэнні тэм «Назоўнік», «Прыметнік», «Дзеяслоў», «Займеннік». Яны накіраваны

на развіццё мовы вучняў, павышэнне іх пісьменнасці і паспрыяюць:

1) удакладненню і ўпарадкаванню слоўнікавага запасу школьнікаў;

2) пашырэнню ўяўленняў пра спалучальнасць абстрактных назоўнікаў;

3) папярэджанню памылак і недакладнасцяў ва ўжыванні абстрактных назоўнікаў, якія абазначаюць пачуцці чалавека ў адносінах да асобы;

4) пастаяннаму ўзбагачэнню слоўніка вучняў новымі словамі;

5) засваенню школьнікамі спалучальнасці абстрактных назоўнікаў адзначанай семантычнай групы.

## Літаратура

1. *Виноградов В. В.* Из истории изучения русского синтаксиса. М., 1958. С. 393.

2. *Костомаров В. Г.* Изучение лексического значения и сочетания слов //Русский язык в национальной школе. 1958. № 2. С. 39—44.

## Summary

*The article deals with the problem of speech development of primary schoolchildren when they learn the rules of combination for a lexico-semantic group of abstract nouns. The author gives exercises which aim at enlargening the vocabulary of schoolchildren, as well as mastering the norms of literary Belarusian.*

УДК 8(47)82+408.52

*А. П. Груцо*

Б+8Р1

# А. С. Пушкин и русский литературный язык новейшей поры

Развитие русского литературного языка старшей поры, как известно, характеризовалось вытеснением элементов церковнославянского языка, болгарского по своему происхождению, и наличием прежде всего элементов русской разговорной речи, закрепившихся в деловой письменности. В результате сложилась его книжно-славянская модификация, функционировавшая в конце XI — второй половине XVII в. преимущественно в проповеднической, житийной, паломнической литературе и других жанрах церковно-книжной письменности. Однако вплоть до М. В. Ломоносова